**Грыгор’еў, А.** Маланкі ўначы / А. Грыгор’еў // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 1974. – 23 лют. – С. 2–3.

# МАЛАНКІ ЎНАЧЫ

З першых сваіх баявых крокаў партызаны 1-й Дрысенскай брыгады стварылі невыносныя ўмовы для фашысцкіх захопнікаў. Народныя мсціўцы рабілі раптоўныя налёты на варожыя абозы, узрывалі масты і пераправы, арганізоўвалі засады, знішчалі жывую сілу і тэхніку праціўніка. У жорсткіх баях гартавалася мужнасць лясных салдат. Вораг не ведаў спакою ні днём, ні ўначы.

Нямецкае камандаванне прымала розныя захады для знішчэння партызан. Наладжваліся карныя экспедыцыі, аблавы на мірнае насельніцтва, у фашысцкае рабства вывозіліся сотнямі і тысячамі юнакі і дзяўчаты. З Берліна паступалі строгія ўказы аб узмацненні аховы чыгунак. Усе чыгуначныя станцыі і масты агароджваліся калючым дротам, узводзіліся бліндажы і дзоты, бетанаваныя агнявыя кулямётныя кропкі. На сотні метраў ад дарог высякаўся лес.

Аўтар у сваіх нататках узнаўляе старонкі гераічнай барацьбы партызан 1-ай Дрысенскай брыгады супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

***

…Пачатак аперацыі быў назначаны на ноч 3 чэрвеня 1943 года. Напярэдадні ў штабе брыгады сабраліся ўсе камандзіры, камісары і начальнікі штабаў атраў. Кожнаму з іх быў намечаны канкрэтны ўчастак чыгункі, дакладна вызначаны маршрут руху, парадак дзеяння і адыходу на зыходныя пазіцыі. Дамовіліся аб спосабах сігналаў…

Партызаны з нецярпеннем чакалі пачатку аперацыі. Толавых шашак, капсуляў-дэтанатараў і шнуроў да іх у атрадах хапала, хапала і мужнасці ў лясных салдат. Яна гартавалася ў штодзённых сутычках з ворагам, вяла ўперад мужных сыноў Айчыны. І як толькі густы вечаровы змрок ахутаў зямлю, нябачна і нячутна крануліся на баявое заданне партызаны. А яшчэ раней лясная цемень паглынула разведчыкаў. Яны павінны былі разведаць і ўдакладніць абстаноўку на чыгунцы, а потым аб усім далажыць сваім камандзірам. Ад іх у многім залежыў увесь зыход намечанай аперацыі. Вочы і вушы партызан, разведчыкі не мелі права ні ў чым памыліцца…

У тую памятную чэрвеньскую ноч атрад імя Суворава, у саставе якога ўдзел у аперацыі прымалі непасрэдна я і аператыўны работнік штаба брыгады А. В. Кужаль, займаў участак чыгункі ад пераезду Марцінава да станцыі Дрыса. Праз паўгадзіны прыбыў наш сусед, атрад імя Леніна, якім камандваў С. Д. Дзеліжонак. У поўнай цішыні ўзводы занялі зыходныя пазіцыі, разведчыкі пайшлі ўперад, разведаць мясцовасць. У сінім сутонні ледзьве ўгадваліся абрысы дрэў, а за імі пралягала шырокая паласа высечанага лесу. Чаканне было напружаным. У кожнага аўтаматы – на ўзводзе.

І раптам у начное неба ўзвілася ракета. Відаць, хтосьці ў цемры дакрануўся да туга нацягнутага дроту, на ўсе лады зазвінелі начэпленыя на яго бляшанкі ад кансерваў, і ў той жа момант прагрымела нямецкая аўтаматная чарга.

Чакаць было нельга. З магутным «ура!» імчаліся партызаны да чыгуначнага палатна. Ад нечаканасці і страху ахова чыгункі кінулася ўрассыпную. Здавалася, не існавала ў гэты час такой сілы, якая змагла б спыніць народных мсціўцаў. Пачалася хуткая работа па мінiраванню рэек. А праз некаторы час загрымелі выбухі. Над чыгункай пералівалася зарыва агню, узляталі вывернутыя з зямлі шпалы і пакурожаныя рэйкі.

У гэтай аперацыі асабліва вызначыліся камандзір узвода разведкі Е. Лаўчыноўскі, разведчыкі В. Аксёнаў, А. Пазняк, А. Ліпаўка, Н. Костык, камандзір узвода В. Гірс, партызаны Ф. Тум, В. Цярэшка, І. Харытоненка і іншыя баявыя таварышы

Паўторную аперацыю па разбурэнню чыгуначнага палатна мы правялі праз пятнаццаць дзён. 18 жніўня роўна ў 12 гадзін ночы партызанскі атрад імя Суворава пад покрывам цемры незаўважна і ўшчыльную падабраўся да чыгункі ў раёне вёскі Траскоўкі. Гітлераўцы аказалі даволі жорсткае супраціўленне, аднак сур'ёзных страт «сувораўцы» не панеслі. А яшчэ праз некаторы час чыгуначная ахова была знішчана і часткова рассеяна ў начы.

Кіраваў усёй дзейнасцю партызан па мініраванню чыгуначнага палатна начальнік штаба атрада К. Кузьміцкі. Падрыўнікі спешна, пакуль не паспелі на дапамогу сваім немцы з бліжэйшых пунктаў аховы, мініравалі рэйкі. Кароткімі сапёрнымі лапаткамі яны рабілі гнёзды для ўзрыўчаткі, устаўлялі і засыпалі пяском «багатую начынку», адцягвалі шнуры. Час ад часу хлопцы прыспешвалі адно другога, і ў душы кожнага расла неўтаймаваная радасць хоць і невялікай, але ўсё ж перамогі над ворагам. Як рэкі пачынаюцца з ручайкоў, так і вялікая перамога пачынаецца з вось такіх, непрыкметных у агульным маштабе аперацый. А колькі іх праводзілася наўсцяж па ўсёй Беларусі! Вогненныя маланкі ўначы асвятлялі шлях да вызвалення, вялі на свяшчэнную бітву, за родны край, сваю Айчыну.

… Адзін за другім прагрымелі выбухі. Барвянае палотнішча пажару расцякалася ўсё шырэй і шырэй, ахоплівала паўнеба. А недзе на другіх участках таксама вяліся гарачыя сутычкі з ворагам, і ляцелі ў паветра рэйкі, шпалы, грымелі пад адхон цягнікі з жывой сілай і тэхнікай. Галоўныя варожыя камунікацыі на значны час заставаліся без падмацавання, а гэта садзейнічала хуткаму прасоўванню наперад рэгулярных часцей нашай арміі. І хаця да канца вайны заставалася два доўгіх гады, усё-такі жаданая перамога ўжо ясна вырысоўвалася на агульным фоне.

Натомленыя, але ўзбуджаныя і радасныя, вярталіся мы пад самую раніцу ў свае лясныя сховы. Ішлі лёгка, бо плечы не мулялі цяжкія скрынкі з толам, узрыўчаткай. Яны, гэтыя цяжкія скрынкі, саслужылі нам добрую службу і яшчэ не адзін дзесятак разоў саслужаць у нялёгкім партызанскім жыцці-быцці. Вайна навучыла нас вайне, навучыла жыць, разбірацца ва ўсіх яе тонкасцях. Чалавек, ён прывычны да ўсяго. За гады вайны мы прывыклі недасыпаць начамі, прывыклі гадзінамі ляжаць у засадзе па плечы ў калючым снезе. І толькі не маглі да аднаго прывыкнуць, што вораг яшчэ ходзіць па нашай зямлі, гвалтоўнічае, забівае ні ў чым не павінных людзей.

І мы ваявалі, мы ішлі ў самае пекла, паміралі і сваёю смерцю сцвярджалі жыццё на зямлі. Камуністы і камсамольцы былі заўсёды наперадзе, сваім прыкладам натхняючы на подзвіг іншых. Добра памятаецца, як двое нашых партызан-разведчыкаў Лісоўскі і Гаркоўскі ў адной з вёсак Галубаўшчыны прынялі на сябе бой з нямецкімі карнікамі, якіх налічвалася каля 40 чалавек. У той вечар 1944 года камандзір атрада імя Леніна С. Дзеліжонак праводзіў сярод насельніцтва калгаса «Зара» растлумачальную работу. Людзей у хаце набілася біткам, усе прыйшлі паслухаць партызанскага камандзіра.

Тым часам карны атрад падыходзіў да вёскі. Разведчыкі пазнавата іх заўважылі, аднак не разгубіліся і прынялі смелае рашэнне.

– Першы і другі ўзводы, абыходзьце справа! – крыкнуў Лісоўскі, даўшы кароткую чаргу з аўтамата.

– Трэці ўзвод, за мной! – падаў зычна каманду Гаркоўскі, – агонь!..

Карнікі ў бой не ўступілі, палічыўшы, што тут вялікая партызанская сіла. І калі на дапамогу смельчакам, пачуўшы страляніну, прыбеглі С. Дзеліжонак і П. Мацкевіч, немцы і паліцаі адступілі…

Гэта яшчэ раз пацвярджае, якімі мужнымі, вынаходлівымі аказваліся звычайныя вясковыя хлопцы, звыклыя да працы хлебароба, дагэтуль не трымаўшыя зброі ў руках.

Што ж, вайна была суровай школай выпрабавання мужнасці, стойкасці савецкага чалавека. І ён вытрымаў гэты нялёгкі экзамен…

**А. ГРЫГОР’ЕЎ,**

***былы камандзір 1-й Дрысенскай партызанскай брыгады***